# Абагульненне па раздзеле «Беларусь і свет у 1917–1945 гг.»

## Працуем з паняццямі

**1.** Вывучыце прапанаваны пералік паняццяў і падзяліце іх на групы. Крытэрыі падзелу на групы вызначце самастойна.

*Агрэсія, акупацыя, асадніцтва, атэізм, аўтарытарны рэжым, беларусізацыя, беларуская нацыянальная дзяржаўнасць, Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных адносін, генацыд, індустрыялізацыя, калабарацыянізм, калектывізацыя сельскай гаспадаркі, культурная рэвалюцыя, метад сацыялістычнага рэалізму, нацызм, новая эканамічная палітыка, падпольная барацьба, партызанскі рух, сацыялістычная рэвалюцыя, сусветны эканамічны крызіс, фашызм.*

**2.** Вызначце паняцці, якія адносяцца да гісторыі Беларусі. Канкрэтызуйце іх прыкладамі вывучаных гістарычных фактаў (падзей, з’яў, працэсаў).

## Чытаем і пераўтвараем розныя віды тэкстаў

**3.** На аснове прапанаваных крыніц інфармацыі складзіце тэзісны план адказу на пытанне «Уз’яднанне Заходняй Беларусі і БССР — акт гістарычнай справядлівасці і воля народа Беларусі».

З прамовы па радыё старшыні Савета Народных Камісараў СССР тав. В. М. Молатава

17 верасня 1939 г.

Таварышы! Грамадзяне і грамадзянкі нашай вялікай краіны!

Польская дзяржава і яе ўрад фактычна перасталі існаваць. З прычыны такога становішча заключаныя паміж Савецкім Саюзам і Польшчай дамовы спынілі сваё дзеянне.

...Савецкі ўрад да апошняга часу заставаўся нейтральным. Але ён... не можа больш нейтральна ставіцца да становішча, якое склалася.



*Сустрэча Чырвонай арміі жыхарамі Гродзеншчыны (1939 г., з архіва БЕЛТА)*




*Нацыянальны склад Народнага сходу Заходняй Беларусі (чал.)*

Ад Савецкага ўрада нельга таксама патрабаваць абыякавага стаўлення да лёсу адзінакроўных украінцаў і беларусаў, якія ў Польшчы і раней знаходзіліся на становішчы бяспраўных нацый, а цяпер і наогул кінуты на волю лёсу. Савецкі ўрад лічыць сваім свяшчэнным абавязкам падаць руку дапамогі сваім братам-украінцам і братам-беларусам, што насяляюць Польшчу.

З прычыны ўсяго гэтага ўрад СССР уручыў сёння раніцай ноту польскаму паслу ў Маскве, у якой заявіў, што Савецкі ўрад аддаў распараджэнне Галоўнаму камандаванню Чырвонай Арміі даць загад войскам перайсці мяжу і ўзяць пад сваю абарону жыццё і маёмасць насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі.

«Праўда», 18 верасня 1939 г.

## Аналізуем, тлумачым, разважаем

**4.** Прааналізуйце звесткі са статыстычнай табліцы «Страты насельніцтва ў гады Другой сусветнай вайны». Зрабіце вывады.

| Краіны | Ваеннаслужачыя, тыс. чал. | Грамадзянскае насельніцтва, тыс. чал. |
|---|---|---|
| **СССР** | 8700 | 17 900,0 |
| **ЗША** | 416,8 | Каля 6 |

| Краіны | Ваеннаслужачыя, тыс. чал. | Грамадзянскае насельніцтва, тыс. чал. |
|---|---|---|
| **Вялікабрытанія** | 382,6 | 67,1 |
| **Польшча** | 123 | Каля 6000 |
| **Францыя** | 217,6 | Каля 400 |
| **Германія** | 6 923,7, з іх 3/4 на савецка-германскім фронце | Каля 3300 |
| **Італія** | 301,4 | 153,1 |

**5.** Чым, на вашу думку, тлумачацца суадносіны страт сярод ваеннаслужачых і мірнага насельніцтва розных краін? Канкрэтызуйце сваю думку вывучанымі гістарычнымі фактамі.

**6.** Выявіце ўзаемасувязь гістарычных фактаў:

- Версальская дамова — прыход нацыстаў да ўлады ў Германіі;
- заканчэнне Першай сусветнай вайны — узмацненне нацыянальна-вызваленчага руху ў краінах Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі;
- Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. у Расіі — Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. у Расіі;
- сусветны эканамічны крызіс — узмацненне ўплыву фашысцкіх партый;
- утварэнне СССР — узбуйненне тэрыторыі БССР;
- індустрыялізацыя ў СССР — перамога СССР у Вялікай Айчыннай вайне.

## Сістэматызуем веды

**7.** Выкарыстоўваючы стужку часу, прадстаўленую ў пачатку раздзела II, выканайце наступныя заданні.

- Якімі падзеямі/з’явамі/працэсамі вы б дапоўнілі стужку часу? Чаму?
- Прапануйце форму для іх абазначэння (карціна, картасхема, цытата, фотаздымак і інш.).

- Прадстаўце развіццё Беларусі ў 1917–1945 гг. у выглядзе лагічнай схемы (ментальнай карты). Адлюструйце ў ёй эканамічнае, палітычнае, сацыяльнае і духоўнае развіццё рэспублікі ў згаданы перыяд.

8. Праца ў міні-групах. Якія сацыяльныя, эканамічныя і культурныя заваёвы вывучанага перыяду Беларусь захоўвае сёння?